**VII Майскіх Віткаўскіх чытанняў**
**“Вечна табе на радзіму глядзець”**

Чытанні прайшлі ў перыяд з 13 па 18 мая 2014 года і іх кірункам сталі:

- Васіль Вітка: эпоха, лёс, творчасць;
- Вітказнаўства на сучасным этапе: кірункі і падыходы;
- Творчасць Васіля Віткі і беларуская славеснасць;
- Случчына ў творчай спадчыне Васіля Віткі

Чытанні пачаліся Online-імпрэзай “Вечна табе на радзіму глядзець”. Відэамост злучыў Слуцкую раённую цэнтральную бібліятэку з дзіцячай бібліятэкай-філіялам №6 імя В. Віткі ДУ “Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк г. Мінска”. На гадзіну адна з залаў бібліятэкі ператварылася ў імправізаваную відэастудыю. Удзельнікамі відэамаста былі галоўны рэдактар часопіса “Вясёлка”, пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, Літаратурных прэмій імя Янкі Маўра і Васіля Віткі, старшыня праўлення Беларускага дзіцячага фонду Уладзімір Ліпскі і лаўрэат прэміі часопіса "Вясёлка" імя Васіля Віткі, пісьменніца Раіса Баравікова.



*Online-імпрэза “Вечна табе на радзіму глядзець”*

– Жыццё пасля жыцця... Гэтыя словы – пра слаўнага сына Случчыны Васіля Вітку. Яго няма ў гэтым жыцці, але творчая спадчына паэта і пісьменніка па-ранейшаму дорыць столькі радасці, натхняе, узбагачае чытачоў розных узростаў. Мне пашчасціла ведаць гэтага чалавека, ён быў вельмі таленавітым, а галоўнае – чулым, добрым, сумленным. Случчане па праве ганарацца сваім земляком, рабіце ж усё, каб жыццё пасля жыцця Васіля Віткі працягвалася, - так пачаў размову пра нашага слыннага земляка галоўны рэдактар часопіса “Вясёлка”.

Уладзімір Сцяпанавіч распавядаў пра «Вясёлку» і новы часопіс для дашкольнікаў «Буся», звярнуўся да юных чытачоў, каб яны шанавалі родную мову. Кранальнымі былі ўспаміны пра Васіля Вітку беларускай пісьменніцы, члена рэдакцыйнай калегіі часопіса «Вясёлка» Раісы Андрэеўны Баравіковай. Падчас «відэамоста» случчан віталі дырэктар Цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі горада Мінска імя М. Астроўскага Таццяна Швед, загадчыца дзіцячай бібліятэкі-філіяла №6 імя В. Віткі горада Мінска Тамара Патук. Мінчане правялі для случчан віртуальную экскурсію па музеі часопіса «Вясёлка», размешчаным у дзіцячай бібліятэцы-філіяле №6 імя В. Віткі, паказалі ўрывак з «лялечнай» пастаноўкі «Вавёрчынага гора».



*Віртуальныя зносіны – гэта сучасна*

У ходзе сустрэчы былі разгледжаны пытанні вывучэння біяграфіі і творчасці Васіля Віткі, праблемы дзіцячай літаратуры XXI стагоддзя, прадстаўлены досвед работы бібліятэк і школ з віткаўскай спадчынай і з кнігамі сучасных беларускіх літаратараў. Шчырая размова ішла пра літаратурную і грамадскую дзейнасць пісьменніка, яго уплыў на беларускую дзіцячую літаратуру, на творчасць маладых аўтараў. Яшчэ раз была падкрэслена значнасць асобы Васіля Віткі.



*Член саюза пісьменнікаў Беларусі Г.Міклашэвіч на сустрэчы з чытачамі “Случчына - маленства майго ідылія”*

Літаратурны гурт “Вася Вясёлкін і К” дзіцячага аддзела пацешыў прысутных звонкім песенным марафонам. Слуцкія гімназісты і іх мінскія сябры пранікнёна

чыталі вершы Васіля Віткі, іншых беларускіх аўтараў. Імпрэза была прасякнута лірычнасцю, добрым, “сонечным” настроем, як і творы пісьменніка-земляка.

Працягам гаворкі пра пісьменніка стала пасяджэнне літаратурна-музычнага салона “Ліра”, які працуе ў дзіцячым аддзеле бібліятэкі больш за 20 гадоў. На імпрэзу “Случчына - маленства майго ідылія” завіталі навучэнцы гарадской музычнай школы. Пад музычны акампанемент ішла размова дзяцей з беларускай пісьменніцай Ганнай Міклашэвіч пра творчасць Васіля Віткі, зачытваліся ўрыўкі з яго твораў.



*Літаратурны квэст “Роднага слова ўсмешка”*

Гучныя чытанні вершаў і казак пісьменніка “Жыў на свеце дзед Васіль” прайшлі ў рамках праграмы “Чытаем разам” для чытачоў дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. Чытанне і абмеркаванне твораў завяршылася вернісажам дзіцячых малюнкаў “Казкі і краскі” па матывах кніг Васіля Віткі. Літаратурны гурт з Акцябрскай сельскай базавай школы паставіў тэатралізаваную пастаноўку казкі “Вавёрчына гора” і паўдзельнічаў у квэсце “Роднага слова ўсмешка”.

Для чытачоў сярэдняга школьнага ўзросту быў праведзены Дзень інфармацыі “Маладым беларусам пра вялікую Беларусь”. Наведвальнікі бібліятэкі здзейснілі падарожжа па старонках кніг: знаёміліся з сімволікай нашай краіны, гарадамі і гарадскімі пасёлкамі, помнікамі архітэктуры, узгадалі гісторыю, знакамітых людзей, якія жылі і жывуць на нашай зямлі, любаваліся выдатнай беларускай прыродай. Быў



*Літаратурны гурт з Акцябрскай базавай школы*

аформлены адкрыты прагляд літаратуры "Зямля пад белымі крыламі”. Зразумела, не абыйшлося без расповеда пра гісторыю Случчыны, літаратурнае сузор’е нашага краю, у якім ззяе і яркая зорка Васіля Віткі.

Інтэлектуальная вандроўка “Урокі Васі Вясёлкіна”, праведзеная для першакласнікаў, падкрэсліла настаўніцкі талент нашага земляка.

Прэзентацыя кнігі “Васіль Вітка. Выбраныя творы”, выдадзенай у серыі ”Беларускі кнігазбор”, сабрала ў чытальнай зале дзіцячага аддзела настаўнікаў, вучняў старэйшых класаў, навучэнцаў абласнога кадэцкага вучылішча і мясцовых краяведаў.



На цэрымоніі ўручэння медаля імя В.Віткі

Завяршыўся Віткаўскі тыдзень паездкай лепшых чытачоў беларускай кнігі (малодшы ўзрост) ў рэдакцыю часопіса “Вясёлка”, а падлеткі пабывалі ў Беларускім дзяржаўным цырку на цэрымоніі ўручэння медаля імя В.Віткі лепшым творцам па выніках за 2013 год.



*У Беларускім дзяржаўным цырку*

Віткаўскія чытанні, далучаючы іх удзельнікаў да вялікай скарбніцы беларускай літаратуры, з'явіліся магутным стымулам да яднання сіл творчай інтэлігенцыі, настаўнікаў, бібліятэкараў, вучняў у імя выхавання добрых пачуццяў у сэрцах і душах дзяцей, стварэння станоўчага культурнага іміджу нашага рэгіёну.

**VIII Майскія Віткаўскія чытанні**